Голас Радзімы

№ 23 (1957)
5 чэрвеня 1986 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

Гэты сонечны суботні дзень надоўга застанецца ў памяці мінчан і гасцей сталіцы Беларусі. 24 мая тут упершыню адбылося вялікае тэатралізаванае мастацка-спартыўнае свята горада, якое ў далейшым будзе традыцыйным.
Рыхтавацца да яго мінчане пачалі загадзя: добраўпарадкавалі свае двары, скверы, вуліцы і плошчы, любоўна ўпрыгожылі іх кветкамі і зелянінай. У муніцыпалітэце Мінска быў створаны каардынацыйны савет свята, ішло грамадскае абмеркаванне яго назвы, эмблемы... Агульнымі намаганнямі былі пазначаны абрысы будучага свята: гэта павінен быць вясёлы карнавал для жыхароў усіх узростаў, парад народных талентаў.
Эпіцэнтрам, калі можна так сказаць, усяго свята сталі паркі, скверы, алеі, вуліцы і плошчы гістарычнай зоны Мінска вакол Свіслачы.
(Пра падзеі гэтага дня чытайце рэпартаж «Нараджэнне традыцыі» на 7—8-й старонках).
НА ЗДЫМКАХ: адно з галоўных месцаў гулянняў мінчан — праспект Машэрава; выступае ансамбль «Харошкі»; на святочным кірмашы можна набыць любое ўпрыгажэнне.

ЗАЯВА САВЕЦКАГА ЎРАДА

Урад Злучаных Штатаў зрабіў крок, які зноў з усёй відавочнасцю выяўляе сутнасць цяперашняга амерыканскага знешнепалітычнага курсу як накіраванага на ўсямерную гонку ўзбраенняў, мілітарызацыю касмічнай прасторы, нагнятанне міжнароднай напружанасці.

Прэзідэнт Рэйган аб'явіў 27 мая г. г. аб фактычнай адмове ЗША захоўваць у далейшым савецка-амерыканскія дагаворна-прававыя дакументы аб абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў — часовае пагадненне 1972 года і Дагавор АСУ-2 1979 года. Ён заявіў, што, прымаючы ў будучым рашэнні, якія датычаць будаўніцтва амерыканскіх стратэгічных сіл, ЗША не будуць прытрымлівацца абмежаванняў, прадугледжаных пагадненнямі па АСУ.

Такім чынам, тое, аб чым папярэджваў Савецкі Саюз, адбылося. Адміністрацыя ЗША з усіх варыянтаў яе магчымых дзеянняў у адносінах да дагавораў і пагадненняў, якія абмяжоўваюць стратэгічныя ўзбраенні, прыняла іменна той, які падрывае фундамент працэсу абмежавання і скарачэння такіх узбраенняў. Паўстаўшы перад выбарам, ці зрабіць больш умеранымі ўласныя праграмы ўзбраенняў або адкрыць шлюзы для бескантрольнай іх гонкі, Вашынгтон аддаў перавагу апошняму.

Рашэнне прэзідэнта азначае, што цяперашняе амерыканскае кіраўніцтва пайшло на выключна небяспечную меру ў справе разбурэння дагаворнай сістэмы, якая стрымлівае гонку ядзерных узбраенняў і тым самым стварае ўмовы для заключэння новых дагаворанасцей.

Канкрэтна выхад ЗША з Дагавора АСУ-2 запраграміраван на канец гэтага года, калі ў працэсе разгортвання новых узбраенняў, у прыватнасці, цяжкіх бамбардзіроўшчыкаў з крылатымі ракетамі, ЗША пераступяць цераз устаноўленую мяжу ў 1 320 адзінак для стратэгічных носьбітаў, аснашчаных раздзяляльнымі галаўнымі часцямі індывідуальнага навядзення. Прэзідэнтам прама заяўлена, што ЗША не будуць дэманстраваць адпаведную колькасць наяўных узбраенняў, для таго каб не перавышаць гэты ўзровень.

Па сутнасці адміністрацыя ЗША ўзяла курс на рэалізацыю ў поўным аб'ёме прынятай ёю ўсеабдымнай стратэгічнай праграмы нарошчвання ядзерных узбраенняў, якую ў пэўнай меры стрымліваюць рамкі пагадненняў па АСУ. ЗША, у прыватнасці, маюць намер, разам з разгортваннем бамбардзіроўшчыкаў Б-52 і Б-1Б з крылатымі ракетамі вялікай дальнасці, стварыць другі новы тып МБР — «Міджытмен», разгарнуць яшчэ 50 адзінак МБР «МХ», паскорыць стварэнне «навейшай крылатай ракеты». Будуць, як аб'яўлена, працягвацца работы і па стварэнню ўдарных касмічных узбраенняў у рамках праграмы «зорных войнаў».

Намечаны на бліжэйшы час дэмантаж дзвюх падводных лодак-ракетаносцаў «Пасейдон» у сувязі з увядзеннем у строй 8-й падводнай лодкі тыпу «Трайдэнт» афіцыяльна тлумачыцца меркаваннямі эканоміі бюджэтных сродкаў, а зусім не жаданнем выконваць палажэнні Дагавора АСУ-2.

Усё гэта спрабуюць апраўдаць нейкімі «парушэннямі» пагадненняў з боку Савецкага Саюза. Але падобныя сцвярджэнні галаслоўныя ад пачатку і да канца. Такіх парушэнняў не было і няма. І ўраду ЗША аб гэтым добра вядома. Савецкі бок неаднаразова з фактамі ў руках выкрываў спробы Вашынгтона з увядзеннем кожнай новай амерыканскай ваеннай праграмы, якая не ўкладваецца ў існуючыя дагаворныя абмежаванні, прад'яўляць надуманыя абвінавачванні ў адрас Савецкага Саюза.

Прынцыповы падыход СССР да існуючых дагаворанасцей у галіне абмежавання ўзбраенняў вядомы. Усе ўзятыя на сябе абавязацельствы савецкі бок выконваў і выконвае строга і ў поўным аб'ёме. Пры гэтым ён зыходзіць з таго, што працяг выканання на ўзаемнай аснове прадугледжаных Дагаворам АСУ-2 абавязацельстваў меў бы істотнае значэнне для падтрымання стратэгічнага балансу і ўмацавання бяспекі.

Аднак адміністрацыя ЗША кіруецца іншымі меркаваннямі. Яна ўжо і раней нямала зрабіла для падрыву Дагавора АСУ-2, які з'явіўся вынікам шматгадовага супрацоўніцтва СССР і ЗША ў 70-х гадах у справе спынення гонкі ракетна-ядзерных узбраенняў, умацавання стратэгічнай стабільнасці. Спачатку нератыфікацыя дагавора, затым абход яго палажэнняў за кошт разгортвання ў Заходняй Еўропе ракет першага ўдару — балістычных «Першынг-2» і крылатых, адступленне ад асобных яго палажэнняў, а цяпер і прамая адмова ад дагавора.

Усё гэта робіць яшчэ больш відавочным, чаму амерыканская адміністрацыя займае такую неканструктыўную пазіцыю на жэнеўскіх перагаворах па ядзерных і касмічных узбраеннях, як і ў пытанні аб тым, якой павінна быць новая савецка-амерыканская сустрэча на вышэйшым узроўні. Адначасова гэта пацвярджае абгрунтаванасць савецкай пазіцыі наконт таго, што для правядзення такой сустрэчы неабходны гатоўнасць амерыканскага боку да дасягнення на ёй канкрэтных вынікаў прынамсі па аднаму-двух пытаннях у галіне бяспекі, а таксама наяўнасць адпаведнай палітычнай атмасферы. Ясна, што зроблены Злучанымі Штатамі абуральны крок ніяк не сведчыць ні аб тым, ні аб другім.

Павінна быць ясна і тое, што Савецкі ўрад не будзе безудзельна глядзець, як Злучаныя Штаты падрываюць дасягнутыя пагадненні ў галіне абмежавання стратэгічных наступальных узбраенняў. У амерыканскага боку не павінна быць ніякіх ілюзій, што яму ўдасца дабіцца ваенных пераваг для сябе за кошт бяспекі іншых.

Як толькі ЗША перавысяць устаноўленыя ўзроўні ўзбраенняў або іншым чынам парушаць выконваемыя бакамі да гэтага часу іншыя асноўныя палажэнні ўказаных пагадненняў, Савецкі Саюз будзе лічыць сябе свабодным ад адпаведных абавязацельстваў па часоваму пагадненню 1972 года і Дагавору АСУ-2 і прыме неабходныя практычныя меры па недапушчэнню падрыву ваенна-стратэгічнага парытэту. Гэтыя меры выключаць магчымасць атрымання Злучанымі Штатамі пераваг па асноўных відах новых стратэгічных узбраенняў, якія яны цяпер распрацоўваюць і маюць намер увесці ў баявы састаў.

Савецкі Саюз будзе і надалей прымаць усе меры для надзейнага забеспячэння бяспекі сацыялістычнай садружнасці, будзе і надалей рабіць усё неабходнае для ўмацавання міжнароднай бяспекі.

КАСМІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

НА КАЛЯЗЯМНОЙ АРБІЦЕ

У адпаведнасці з праграмай палёту арбітальнага комплексу «Салют-7» — «Саюз Т-15» — «Космас-1686» касманаўты Леанід Кізім і Уладзімір Салаўёў 28 мая ажыццявілі выхад у адкрытую касмічную прастору працягласцю 3 гадзіны 50 мінут.

Асноўнай задачай выхаду была адпрацоўка метадаў зборкі ў космасе буйнагабарытных канструкцый. У якасці тыпавога элемента выкарыстоўвалася шарнірна-рашотчатая ферма дастаўленая на станцыю «Салют-7» у складзеным стане.

На пераходным адсеку станцыі касманаўты ўстанавілі крапежную платформу, а на ёй змянцравалі блок, які ўключае ў сябе шарнірна-рашотчатую ферму і канструкцыю для яе раскрыцця і складвання. Ферма спачатку была раскрыта, а затым вернута ў зыходнае становішча. У час гэтых аперацый экіпаж вёў тэлевізійны рэпартаж і фотаздымку.

На адным з ілюмінатараў рабочага адсека касманаўты ўстанавілі новы прыбор, прызначаны для правядзення эксперыментаў па адпрацоўцы перспектыўнай сістэмы перадачы тэлеметрычнай інфармацыі ў аптычным дыяпазоне даўжыні хваляў.

У працэсе выхаду экіпаж зрабіў дэмантаж касет з узорамі біяпалімераў і розных канструкцыйных матэрыялаў, якія доўгі час знаходзіліся на вонкавай паверхні станцыі, а таксама створанай савецкімі і французскімі спецыялістамі апаратуры, прызначанай для збору метэарытнага рэчыва ў касмічнай прасторы.

Пасля завяршэння праграмы сумеснага палёту праведзена аддзяленне транспартнага карабля «Саюз ТМ» ад арбітальнага комплексу «Мір» — «Прагрэс-26».

У ходзе шасцісутачнага палёту ў складзе арбітальнага комплексу праведзена адпрацоўка новых бартавых сістэм, агрэгатаў і элементаў канструкцыі ўдасканаленага касмічнага карабля. З дапамогай камбінаванай рухальнай устаноўкі карабля выкананы карэкцыі траекторыі руху комплексу.

СХОДЫ

СВЯТА НАРОДАЎ АФРЫКІ

Сход прадстаўнікоў грамадскасці горада, прысвечаны Дню вызвалення Афрыкі і Тыдню салідарнасці з народамі Поўдня Афрыкі, адбыўся ў Мінску. Яго адкрыў старшыня прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі А. Ваніцкі.

Сакратар гарадскога зямляцтва студэнтаў Зімбабве, студэнт Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна Робсан Нкома выказаў удзячнасць працоўным Савецкага Саюза за салідарнасць, актыўную падтрымку народаў Поўдня Афрыкі ў іх справядлівай барацьбе за поўнае выкараненне ганебнага рэжыму апартэіду, за дапамогу маладым афрыканскім краінам у развіцці эканомікі, падрыхтоўцы высокакваліфікаваных нацыянальных кадраў.

Удзельнікі сходу прынялі рэзалюцыю, у якой асудзілі праводзімую ЗША імперыялістычную палітыку экспансіі і неакаланіялізму, праяўленнем якой з'явіўся, у прыватнасці, акт агрэсіі супраць Лівіі, выказалі салідарнасць з барацьбітамі супраць расізму і апартэіду.

ГОСЦІ З-ЗА МЯЖЫ

ЗНАХОДЖАННЕ Ў МІНСКУ

У Мінску знаходзіўся генеральны дырэктар аддзялення Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Жэневе Эрык Сой. Ён быў прыняты міністрам замежных спраў БССР А. Гурыновічам.

Э. Сой наведаў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, мемарыяльны комплекс «Хатынь», дзе ўсклаў кветкі да Вечнага агню. Ён пабываў на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі БССР, азнаёміўся са славутымі мясцінамі і новабудоўлямі горада.

АЙЧЫННАЯ МАРКА

РОБАТ ПРЫЙШОЎ НА КАНВЕЕР

У кабінах авіялайнераў, на пультах кіравання атамных ледаколаў і электрастанцый працуюць прыборы з маркай Віцебскага завода электравымяральных прыбораў. Пастаўляюцца яны ў дзесяткі замежных краін. За мінулую пяцігодку ў цэхах прадпрыемства ўстаноўлены звыш 120 робатаў і маніпулятараў. Іх распрацоўкай займаюцца спецыяльныя заводскія лабараторыі. Сканструяваная тут тэхніка вырабляецца ўласнымі сіламі. За пяць гадоў эканамічны эфект ад укаранення новай тэхнікі і тэхналогіі, аўтаматызацыі вытворчасці склаў больш як два мільёны рублёў.

У штамповачным цэху нядаўна пачала дзейнічаць рабатызаваная лінія па выпуску сучасных прыбораў. У дванаццатай пяцігодцы намечана правесці карэнную рэканструкцыю. У выніку выпуск прадукцыі павялічыцца ў паўтара раза. Прычым, пачнецца выраб прынцыпова новых мікрапрацэсарных сродкаў дыспетчарызацыі, аўтаматыкі і тэлемеханікі.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

МІЖНАРОДНАЯ ШКОЛА-СЕМІНАР

Дзесяць дзён у Мінску пры навукова-даследчым Інстытуце цепла- і масаабмену АН БССР праходзіла міжнародная школа-семінар «Сучасныя праблемы цепла- і масаабмену ў хімічнай тэхналогіі». Яна была арганізавана Міжнародным цэнтрам акадэмій навук сацыялістычных краін для павышэння кваліфікацыі навуковых кадраў.

Трыццаць трэці раз з моманту арганізацыі ў 1973 годзе Міжнароднага цэнтра сабраліся ў Мінску вучоныя з 20 гарадоў Савецкага Саюза, а таксама акадэмій навук Балгарыі, Венгрыі, Польшчы, Чэхаславакіі, Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Тэматыка школы-семінара ўключала шырокае кола пытанняў, якія тычацца выкарыстання працэсаў цепламасапераноса ў адной з сучасных галін прамысловасці — хімічнай.

Удзельнікі семінара мелі вялікія магчымасці для абмеркавання новых ідэй, абмену вопытам, устанаўлення навуковых сувязей са сваімі калегамі. Былі разгледжаны пытанні як тэарэтычныя, так і практычнага характару.

З лекцыямі і дакладамі выступілі вядучыя савецкія і замежныя вучоныя: член-карэспандэнт АН СССР В. Малюсаў, прафесары В. Цвік з ГДР, Р. Пахарэцкі з ПНР, Я. Чэрмак з ЧССР і іншыя.

Міжнародная школа-семінар, на думку яе ўдзельнікаў, паказала яшчэ раз дзейснасць сацыялістычнай інтэграцыі на прыкладзе развіцця адной з канкрэтных галін навукі.

БУДАЎНІЧАЯ ІНДУСТРЫЯ



Паскараць тэмпы ўзвядзення жывёлагадоўчых памяшканняў калектыву Слуцкага сельскага будаўнічага камбіната дапамагае высокі ўзровень заводскай гатоўнасці канструкцый. Выпуск на прадпрыемстве сценавых блокаў з уманціраванымі вокнамі, комплексных пліт пакрыцця, элементаў падлогі і іншых жалезабетонных вырабаў дазволіў давесці ўзровень зборнасці будынкаў на некаторых аб'ектах да 82 працэнтаў.

Нядаўна камбінату перададзена аднатыпнае прадпрыемства ў Пухавічах. Аб'яднанне іх магутнасцей дазволіць наладзіць выпуск паўназборных вытворчых будынкаў. Перасоўныя механізаваныя калоны ўзбуйненага камбіната змогуць штогод узводзіць з уласных канструкцый і здаваць «пад ключ» 220 такіх аб'ектаў.

НА ЗДЫМКУ: адгрузка камплектуючых дэталей для зборных жывёлагадоўчых памяшканняў.

ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

ПРАМЫСЛОВАСЦЬ, РАСЛІНЫ І ЭКАЛОГІЯ

Калі ў сярэдзіне мінулага стагоддзя нямецкі біёлаг Эрнст Гекель прапанаваў тэрмін «экалогія» і даў яе вызначэнне як навукі аб «эканоміцы» прыроды, ён без усякіх сумненняў аднёс новую галіну ведаў да чыста біялагічных навук, да таго раздзела прыродазнаўства, які цікавіцца перш за ўсё жывымі істотамі і вывучае ўсе бакі жыцця біялагічных арганізмаў.

Сёння, больш чым праз 100 гадоў пасля свайго з'яўлення, экалогія стала адной з самых папулярных і модных навук. Кожны даследчык, які хоча быць сучасным, займаецца экалогіяй. Аднак праблемы, што цікавяць «чыстага» эколага, па зместу вельмі адрозніваюцца ад праблем, якія разглядае, напрыклад, батанік, заолаг, генетык або географ, медык ці інжынер. Тым не менш усе яны лічаць, што займаюцца экалогіяй.

І гэта сапраўды так. За апошнія дзесяцігоддзі ў сувязі з вельмі хуткім ростам даследаванняў у галіне экалогіі погляды на яе, як на чыстую біялагічную навуку, радыкальна змяніліся. Сапраўды, ці можна вывучаць сувязі паміж жывымі істотамі і асяроддзем і выключаць пры гэтым чалавека? Так званыя антрапагенныя ўздзеянні (некаторыя вучоныя лічаць больш правільным называць іх антрапічнымі) адыгрываюць усё большую ролю ў зменах навакольнай прыроды і біясферы ў цэлым. Таму вывучэнне сувязей і ўзаемадзеяння паміж чалавекам і біясферай, вызначэнне напрамкаў і тэмпаў далейшай эвалюцыі прыроды нашай планеты ў сувязі з вытворчай дзейнасцю становіцца галоўным прадметам экалагічных даследаванняў. Адной з самых важных задач з'яўляецца распрацоўка навуковых асноў і метадаў аздараўлення навакольнага асяроддзя.

З развіццём прамысловасці забруджванне навакольнага асяроддзя павялічваецца, небяспека ў першую чаргу пагражае паветру і водным рэсурсам. Прамысловыя выкіды аказваюць спецыфічны ўплыў на састаў паветра, вады, глебы і на жывыя арганізмы і з'яўляюцца важным экалагічным фактарам. Напрыклад, пад уздзеяннем дыма-газавых выдзяленняў адбываюцца рэзкія змены ў складзе і знешнім вобліку раслін на даволі значных тэрыторыях. З'яўляюцца шматлікія знешнія пашкоджанні, замаруджваюцца або зусім страчваюцца здольнасці да размнажэння, з ліку прыродных раслінных комплексаў выпадаюць грыбы, лішайнікі, некаторыя травяністыя, кустовыя і дрэвавыя расліны. Адначасова разам з дэградацыяй асобных відаў расліннасці прыжываюцца новыя найбольш дыма- і газаўстойлівыя ў дадзеных умовах віды. У раслін, якія існуюць у зонах уздзеяння прамысловых выкідаў, назіраюцца істотныя адхіленні ў морфа-фізіялагічнай будове, асаблівасцях біяхімічнага складу і інш. Узнікла неабходнасць вывучаць менавіта асаблівасці адаптацыі раслін да разнастайных прамысловых выкідаў, што мае вялікае практычнае значэнне для распрацоўкі біялагічных асноў азеляненння тэрыторыі населеных месцаў і прамысловых прадпрыемстваў, вызначэння метадаў нейтралізацыі шкодных забруджванняў з дапамогай расліннасці. Гэтыя задачы і вырашае новы навуковы напрамак — індустрыяльная дэндраэкалогія, які інтэнсіўна распрацоўваецца ў нашай рэспубліцы.

Новая навука накіравана на пазнанне тых рэальных магчымасцей, якія можа даць расліннасць для загойвання ран, нанесеных індустрыяй жывой прыродзе. Асабліва неабходна развіццё такіх даследаванняў у раёнах канцэнтрацыі прамысловых прадпрыемстваў і фарміравання адпаведных спецыфічных умоў асяроддзя.

Несумненна, што ачыстка асяроддзя ад забруджванняў павінна ажыццяўляцца ў першую чаргу тэхналагічнымі сродкамі: прадпрыемствы абавязаны мець экалагічна дасканалую тэхналогію і дастатковa эфектыўныя ачышчальныя збудаванні. Але і пры паспяховым выкананні гэтых умоў важная роля ў канчатковым паляпшэнні паветранага асяроддзя належыць зялёным насаджэнням.

Напрыклад, адзін гектар зялёных насаджэнняў за гадзіну вылучае такую колькасць кісларода, якую за гэты ж час спажывае 200 чалавек. Такая прыродная фабрыка здольная адфільтраваць з паветра за год 70 тон пылу. Зялёныя насаджэнні ў залежнасці ад памераў, складу і ўзросту затрымліваюць ад 21 да 86 працэнтаў пылу і памяншаюць забруджванне паветра мікробамі на 19—44 працэнты.

Расказвае старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі фізіялогіі ўстойлівасці і жыўлення інтрадуцэнтаў Цэнтральнага батанічнага сада Акадэміі навук Беларусі кандыдат біялагічных навук Нэлі Гяткo:

— З 1967 года мы вывучаем газапаглынальную здольнасць і газаўстойлівасць шэрагу мясцовых і інтрадукаваных (гэта значыць, завезеных з іншых краёў) відаў раслін. У працэсе работы атрыманы важныя эксперыментальныя даныя аб параўнальнай фітатаксічнасці газападобных злучэнняў серы і паглынальнай здольнасці асобных відаў раслін у адносінах да гэтых злучэнняў. Вынікі нашай працы маюць не толькі тэарэтычнае, але і вялікае практычнае значэнне. Яны ўжо выкарыстоўваюцца, напрыклад, пры стварэнні ў прамысловых цэнтрах Беларусі зялёных насаджэнняў, якія маюць пэўную газаўстойлівасць і здольныя ачышчаць атмасферу ад розных забруджванняў, а таксама пры вырашэнні пытанняў захавання існуючай расліннасці вакол гарадоў.

Разам з вучонымі Інстытута эксперыментальнай батанікі Акадэміі навук БССР распрацаваны метад ацэнкі ступені прыстасаванасці раслін да газападобных злучэнняў серы, а таксама новы спосаб кантролю забруджвання атмасферы з дапамогай лішайнікаў. На аснове праведзеных даследаванняў прапанаваны асартымент дрэвава-кустовых, кветкавадэкаратыўных і газонных раслін для азелянення тэрыторый нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў рэспублікі, распрацаваны спецыфічныя прыёмы догляду за імі.

Цікавыя даследаванні правялі вучоныя Беларускага тэхналагічнага інстытута. Доктар біялагічных навук Васіль Анціпаў высветліў, што хвойныя насаджэнні з'яўляюцца выдатным прыродным паветраным фільтрам, які затрымлівае прамысловы пыл і назапашвае ў сваіх тканках злучэнні многіх высокатаксічных элементаў, у тым ліку свінцу, медзі, цынку, кобальту, тытану, хрому, малібдэну.

Індустрыяльная дэндраэкалогія з'яўляецца галіной больш агульнай навукі — індустрыяльнай экалогіі, якая вывучае асаблівасці існавання ўсіх прыродных аб'ектаў, а таксама чалавека ва ўмовах інтэнсіўнай гаспадарчай дзейнасці. У рэспубліцы паспяхова распрацоўваюцца многія праблемы індустрыяльнай экалогіі, некаторыя з якіх уключаюцца ў адпаведныя праекты міжнароднай навуковай праграмы «Чалавек і біясфера». Каардынацыю работ ажыццяўляе Навуковы савет АН БССР па праблемах біясферы, сакратар біялагічнай секцыі якога кандыдат біялагічных навук Канстанцін Чубанаў паведаміў аб цікавых даследаваннях ролі некаторых відаў водарасцей у ачышчэнні забруджаных прамысловымі адходамі вод. Гэтыя даследаванні праведзены ў Інстытуце эксперыментальнай батанікі. Там жа распрацаваны электракаагуляцыйны метад ачысткі сцёкавых вод, вывучаецца ўплыў забруджвання глебы на ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур. У Інстытуце генетыкі і цыталогіі АН БССР даследуецца ўздзеянне тэхнагеннага забруджвання на храмасомны апарат жывёл, што мае вялікае значэнне для вырашэння многіх праблем аховы здароўя чалавека. Адным з важных пытанняў індустрыяльнай экалогіі з'яўляецца арганізацыя экалагічнага маніторынгу — сістэмы назірання і кантролю прыроднага асяроддзя. Вучоныя многіх інстытутаў АН БССР займаюцца распрацоўкай метадалагічных прынцыпаў праграмы маніторынгу і ўдзельнічаюць у стварэнні адпаведных тэхнічных сродкаў. Практычнай рэалізацыяй арганізацыі маніторынгу ў БССР займаюцца Рэспубліканскае ўпраўленне па гідраметэаралогіі і кантролю прыроднага асяроддзя і Беларускі навукова-даследчы інстытут санітарыі і гігіены, якія маюць разгалінаваную сетку кантрольных і назіральных пунктаў па ўсёй тэрыторыі рэспублікі.

Сярод іншых напрамкаў практычнага выкарыстання дасягненняў індустрыяльнай экалогіі вялікае значэнне мае прагназіраванне стану расліннасці ў зонах прамысловага ўздзеяння, стварэнне з дапамогай метадаў і сродкаў зялёнага будаўніцтва паркавых і лесапаркавых зон для масавага адпачынку насельніцтва.

Віктар МАЗОЎКА.

ПІСЬМЫ ЗБЛІЗКУ

ЖАНЧЫНА, ЯКАЯ ВАДЗІЛА ЦЯГНІКІ

У мінскім музеі гісторыі беларускай чыгункі з'явіўся новы экспанат — пажоўклы фотаздымак. На падножцы старэнькага паравоза з імем «Марыя» на тэндэры стаіць танклявая прыгожая дзяўчына ў шынялі і мужчынскай шапцы. Менавіта так выглядала тады першая ў краіне жанчына-машыніст Марыя Арыстава. Старэнькі фотаздымак ажывіў старонкі працоўнай біяграфіі і шчаслівага лёсу. Маладыя чыгуначнікі, якія прыйшлі ў музей на сустрэчу з гэтай цудоўнай жанчынай, пазнаёміліся з жывой легендай.

Мара вадзіць цягнікі жыла ў ёй з дзяцінства. Ведала, што жанчынам няма дарогі на паравоз, і таму, скончыўшы школу, паехала да самога Міхаіла Калініна ў Маскву. Ён уважліва выслухаў Марыю і, на яе радасць, напісаў пісьмо ў Мінскую школу вучнёўства, якая рыхтавала чыгуначнікаў. Прынялі дзяўчыну ў парадку выключэння вучнем слесара, але яна верыла: мара здзейсніцца.

Паспяхова здала выпускныя экзамены, атрымаўшы кваліфікацыю слесара і машыніста. Няхай сабе даверылі ёй усяго толькі маняўровы паравоз, але ж паравоз! А ўжо праз паўгода дазволілі Марыі выйсці ў першы міжгародні рэйс памочнікам машыніста.

Хутка да дзяўчыны прыйшла шырокая вядомасць: першая ў Беларусі і краіне Марыя правяла цяжкавагавы састаў, паказаўшы прыклад эканоміі часу і паліва. Віншавальную тэлеграму ёй прыслаў сам Міхаіл Калінін. Машыніста Леаніда Арыстава, ад якога забралі памочніцу, даверыўшы ёй самастойны паравоз, быццам падмянілі. Рэйсы здаваліся яму бясконца доўгімі, бо ў кабіне не было вясёлай каравокай Марыі. І ён раптам папрасіўся ў начальства да яе ў памочнікі.

— Ды ты, хлопец, з глузду з'ехаў ці што? Яна ж цябе паважаць перастане, — адрэзаў начальнік дэпо. — Замуж трэба браць, калі кахаеш, — вось табе мая парада.

Усё жыццё быў удзячны Леанід Арыстаў за тую параду. А як ганарыўся жонкай, калі вяртаючыся з далёкага рэйса, яна з'яўлялася ў акне паравоза ў сваёй нязменна пунсовай касынцы і вітала яго ў натоўпе. У іх рос сын, яны марылі аб будучыні, але ў іх шчаслівае жыццё ўварвалася вайна. Арыставы стварылі сямейны экіпаж. Прычапілі да паравоза цяплушку, і сын разам з імі пачаў жыць на колах. Курск, Арол, Бранск, Сталінград, Кіеў, Ленінград — хіба пералічыш усе рэйсы? Воінскія эшалоны дастаўляліся на фронт у тэрмін і амаль без страт. І байцы, здзіўленыя тым, што ў кабіне паравоза бачылі жанчыну, стараліся хоць чым-небудзь аддзячыць адважнай Марыі — буханкай хлеба, кавалкам цукру для маленькага Жоры. У чэрвені 1943 года яна паспяхова правяла эшалон з байцамі чэхаславацкай брыгады, і Людвіг Свобада падарыў ёй на памяць кнігу аб Празе з надпісам: «Машыністу, які мяне здзівіў».

Тут жа, у музеі, захоўваецца здымак тых гадоў: Марыя з мужам і сынам — ля сямейнай цяплушкі. Яна ўспамінае, як аднойчы пад бамбёжкай Жора апынуўся каля раненага. Відаць, не маючы сіл разгледзець, хто перад ім, той папрасіў: «Дапамажы, браток». І «браток», які яшчэ не ўмеў чытаць, зрабіў першую перавязку. А калі маці яго пахваліла, нечакана заявіў: «Вось вырасту — стану ўрачом». Праўда, спачатку па сямейнай традыцыі Георгій вадзіў цягнікі. А потым скончыў Мінскі медыцынскі інстытут. Цяпер ён — хірург чыгуначнай бальніцы.

Сорак два гады насіла Марыя Аляксандраўна чыгуначную форму. Яна — ганаровы чыгуначнік СССР, мае ўрадавыя ўзнагароды. Але прыйшоў дзень, і ўрачы сказалі: зрок не дазваляе больш вадзіць цягнікі. І тады ўжо яна пайшла па слядах сына. Скончыла курсы медсясцёр, працавала загадчыцай дзіцячага сада, выхоўвала дзяцей чыгуначнікаў. Сёння Марыя Аляксандраўна на заслужаным адпачынку, атрымлівае пенсію.

Але і цяпер не сядзіць без справы: штодзень спяшаецца то ў дэпо ў савет ветэранаў вайны, то ў сваю былую школу (зараз гэта вучылішча чыгуначнікаў), то ў сярэднія школы горада.

Лілія ЛАМСАДЗЕ.

НАВАСЕЛЛЕ

Не так даўно адзін з маіх сяброў дзяцінства Іван Дашук атрымаў двухпакаёвую кватэру ў Валатаве, новым мікрараёне Гомеля, і запрасіў мяне на наваселле. Запрашэнне я прыняў з удзячнасцю і ахвотаю; наша сяброўства з гадамі не паслабела, і мы радаваліся кожнаму выпадку для сустрэчы.

Сям'я ў Івана невялікая: ён, жонка Надзея ды 3-гадовы сын Сяргейка. Мы п'ём гарачую каву і ўдыхаем пахі яшчэ не абжытай кватэры. Гутарым, весялімся, спяваем...

Наваселле ў гэты выхадны нядзельны дзень спраўляе не толькі Іванава сям'я, а і шмат хто іншы з вялізнага 9-павярховага дома, які вырас на нядаўняй ускраіне Гомеля срод такіх жа гмахаў-братоў. Магчыма, нават ва ўсіх 244 кватэрах накрыты зараз святочныя сталы...

Прайшоў толькі тыдзень пасля засялення, а ўжо вокны ўсіх дзевяці паверхаў упрыгожыліся белымі, сінімі, ружовымі шторамі, на балконах з'явіліся кветкі, а ў пад'ездах — шматлікія дзіцячыя каляскі для немаўлят. Пераважная большасць навасёлаў — маладыя сем'і. Калі скласці гады ўсіх трох членаў Іванавай сям'і, атрымаецца лічба 53.

Суседзі перазнаёміліся літаральна ў першы ж дзень. Жыхары новага дома — людзі розных прафесій і пасад. Іван — тэхнік-аўтамеханік, яго жонка — швачка. Над іх кватэрай засялілася сям'я маладых настаўнікаў, нядаўніх выпускнікоў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, пад ёю — слесара з завода «Гомсельмаш» і работніцы кандытарскай фабрыкі «Спартак». На адной лесвічнай пляцоўцы з маім сябрам сем'і вучонага-фізіка з навукова-даследчага інстытута і выкладчыцы гарадскога музычнага вучылішча, шафёра аўтабазы і прадаўшчыцы магазіна. І толькі на самым ніжнім паверсе гэтага ж пад'езда аднапакаёвую кватэру заняў пажылы чалавек — адзінокі ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Гарвыканком палепшыў яго жыллёвыя ўмовы, перасяліўшы са старога дома...

У дзверы пастукалі, Іван падняўся, пайшоў адчыняць. Яго і Надзеіны вусны расплыліся ва ўсмешцы.

— Гэта да сына.

На парозе стаяў гурт гаманлівай дзятвы. Хлопчыкі і дзяўчынкі шумна ўваліліся ў кватэру і, схапіўшы за рукі Сяргейку, зніклі ў праёме дзвярэй. Ужо праз нейкую хвіліну іх звонкія галасы паглынула ў сабе кабіна ліфта.

Я гледзеў на радасныя твары гаспадароў і думаў: «Як мала трэба чалавеку для шчасця! Каб жыў ён у мірны дзень, займаўся любімай працай, кантактаваў з блізкімі людзьмі, меў дах над галавою...»

М. ЛІПНЯЦКІ.

АМЕРЫКАНСКІЯ ГЕРАНТОЛАГІ Ў ГАСЦЯХ У БЕЛАРУСКІХ КАЛЕГ

ЗАХАВАЦЬ ЖЫЦЦЁ

З амерыканскімі турыстамі мы пазнаёміліся каля аўтобуса, які праз некалькі хвілін павінен быў павезці іх на экскурсію. Толькі ўчора вечарам яны прыляцелі ў наш горад з Кіева і былі рады магчымасці пагаварыць з мінчанамі. З усіх бакоў пасыпаліся пытанні.

Колькі жыхароў у Мінску? Якія буйныя прамысловыя прадпрыемствы працуюць тут? Ці многа універсітэтаў і каледжаў, колькі студэнтаў там вучыцца? Ці ёсць навучальныя ўстановы, дзе рыхтуюць урачоў і медыцынскі персанал? Ці дастаткова бальніц і паліклінік?

Нехта спытаў: «А колькі год вашаму гораду»?

І вельмі многія здзівіліся, даведаўшыся, што амаль дзевяцьсот дваццаць.

— Ён выглядае, як зусім новы горад.

Давялося растлумачыць, што тое, што яны бачаць сёння, сапраўды пабудавана нядаўна, што Мінск неаднаразова разбураўся ў час войнаў. І быў амаль поўнасцю знішчаны ў час другой сусветнай.

— Так, так. Мы ўжо чулі пра гэта. Але калі бачыш Кіеў і Мінск, гэтаму проста цяжка паверыць. Надта ж прыгожыя гарады!

Гутарка спынілася. Турыстаў запрасілі ў аўтобус, і ўсе паспяшаліся заняць свае месцы.

Гэтую экскурсію яны чакалі з асаблівым нецярпеннем. Магчыма, для іх яна была самай цікавай за ўвесь час знаходжання ў нашай краіне. Справа ў тым, што гэта была незвычайная турыстычная група. Большасць яе членаў — медыкі. І не проста медыкі, а спецыялісты ў галіне геранталогіі, навукі, якая займаецца праблемамі старэння чалавечага арганізма, шукае магчымасці працягнення жыцця. Спецыяльна для такой групы супрацоўнікі «Інтурыста» ў Мінску арганізавалі сустрэчу з іх беларускімі калегамі, работнікамі Рэспубліканскага інтэрната ветэранаў вайны і працы.

За акном аўтобуса прамільгнулі раёны новабудоўляў, горад скончыўся. У салоне неяк адразу наступіла цішыня. Турысты ўважліва глядзелі ў вокны. Малюнак сапраўды быў вельмі прыгожы. Яркае сонца асвятляла зялёныя палі, ззяла на гладзі штучных азёр, якія разпораз сустракаліся на шляху, рабіла па-веснавому прывабнымі лясы і пералескі. Дарога была зусім кароткай. Праз пятнаццаць хвілін мы спыніліся каля інтэрната. Ён размешчаны сярод лесу, непадалёку рака і возера.

— Мы рады вітаць тут сваіх амерыканскіх калег, — сказаў дырэктар інтэрната Пётр Печкуроў. — Спадзяюся, вам тут спадабаецца. Давайце спачатку ўсё паглядзім, а потым мы адкажам на вашы пытанні.

Мы прайшлі ў прасторны хол, з якога ў два бакі ідуць шырокія калідоры, што злучаюць усе карпусы інтэрната. Суправаджаючыя групу ўрачы давалі тлумачэнні. Паказалі паштовае аддзяленне з міжгароднімі тэлефонамі-аўтаматамі, правялі па кабінетах мясцовай паліклінікі, дзе некаторыя турысты з задавальненнем паспрабавалі кіслародныя кактэйлі, паказалі сталовую, холы для сустрэч, кіназалу, залу для адпачынку і гульняў, більярдную. Але цікавей за ўсё для членаў групы было пабываць у памяшканнях, дзе жывуць пенсіянеры. Амерыканцы пыталіся, ці пусцяць іх туды. Вядома, ніякіх праблем не ўзнікла. Жыхары інтэрната гасцінна запрашалі іх да сябе.

Жылыя памяшканні ўяўляюць сабой блокі з двух пакояў і санітарнага вузла. Фактычна, звычайная кватэра, толькі без кухні. Але тут яна і не патрэбна. Займаюць такі блок два чалавекі ці сямейная пара. Пытацца аб тым, ці задаволены пенсіянеры, не было патрэбы. Усе самі бачылі, што ўмовы ў інтэрнаце выдатныя.

Праз гадзіну тут панавала незвычайнае ажыўленне. Аказваецца, адміністрацыя не папярэджвала загадзя жыхароў аб прыездзе гасцей, не хацела парушаць іх звычайны рытм жыцця. Ды людзям самім было цікава сустрэцца і пагаварыць з амерыканцамі. Перакладчыкаў было ўсяго два, але многія знаходзілі агульную мову і без іх. Некаторыя пенсіянеры прымацавалі свае ўзнагароды, і турысты з вялікай цікавасцю слухалі, за што яны атрыманы.

— Усё гэта за вайну, — гаварыла амерыканцы Разалін Бюрке пажылая жанчына з двума ордэнамі і многімі медалямі. — Я была медсястрой, выносіла раненых з поля бою. Вайна — самае страшнае, што можа быць у жыцці чалавека. Мы перажылі ўсе яе жахі і больш за ўсё на свеце хочам, каб яна ніколі не паўтарылася. Хочам, каб аб гэтым ведалі і ў вас у Амерыцы.

— Мы таксама хочам, каб савецкія людзі ведалі, што амерыканскаму народу непатрэбна вайна, — адказала Разалін Бюрке. — І мне давялося ўдзельнічаць у вайне, я была медсястрой у В'етнаме. Вядома, гэта зусім другая вайна. Там загінула значна менш людзей. І ўсё ж нават такіх войн не павінна быць ніколі. Я добра ведаю міралюбства савецкіх людзей, асабліва ўрачоў. Мне прыходзілася часта сустракацца з імі ў час работы па лініі Чырвонага Крыжа ў Алжыры. Гэтыя сустрэчы я не забуду ніколі. Тут я яшчэ раз пераканалася ў тым, што ў вашай краіне ніхто не хоча вайны. Аб гэтым я буду расказваць сваім сябрам дома. У нас адны жаданні, і трэба зрабіць усё, каб яны споўніліся.

У прасторнай чытальнай зале сабраліся савецкія ўрачы і амерыканскія госці. Пачалася прафесійная размова. Геранталогія, хоць і займаецца праблемамі старасці, навука маладая. Кантакты вучоных розных краін у гэтай галіне асабліва неабходныя.

— Вы — ужо другая група замежных геранталагаў, якая пабывала ў нас, — адзначыў Пётр Печкуроў. — Не так даўно мы прымалі спецыялістаў з Японіі. Хацелася б, каб такіх сустрэч было больш. Хачу папярэдзіць некаторыя пытанні і больш падрабязна расказаць вам аб нашым інтэрнаце. Мы добра ведаем, што і ў ЗША, і ў іншых краінах ёсць нямала падобных устаноў, у якіх створаны выдатныя ўмовы для жыцця састарэлых людзей. Але іх утрыманне аплачваецца амаль поўнасцю за кошт кліентаў і дабрачынных арганізацый. У нас жа ўсе расходы — за кошт дзяржавы. А яны немалыя. Наш інтэрнат існуе ўжо дванаццаты год. Цяпер тут жыве 176 чалавек. Іх абслугоўвае каля пяцідзесяці медыцынскіх работнікаў, з іх дзевяць урачоў. Мы робім усё магчымае, каб людзі адчувалі сябе тут як дома. Вы самі бачылі, у якіх умовах яны жывуць. Магу дадаць, што чатыры разы на тыдзень у нас у кіназале дэманструюцца новыя кінафільмы, рэгулярна арганізоўваюцца розныя экскурсіі, наведванні канцэртаў і тэатраў. Усё гэта каштуе немалых грошай. Знаходжанне ў інтэрнаце аднаго чалавека абыходзіцца дзяржаве каля двухсот пяцідзесяці рублёў у месяц. А толькі ў нашай рэспубліцы 78 падобных устаноў.

З месца ўзняўся адзін з членаў групы.

— Мяне завуць Тэд Кокс, — прадставіўся ён. — Я і мая жонка Рут працуем у падобным доме для пенсіянераў у невялікім горадзе Бейсін у штаце Вайомінг. Нам было вельмі цікава пабываць тут, і мы былі б вельмі рады бачыць вас у сябе.

Ужо па дарозе назад у горад да нас падышла кіраўнік групы Джыні Кайзер-Джоунс, доктар медыцыны з Каліфарнійскага універсітэта.

— Вы збіраецеся пісаць аб нашай групе? — спыталася яна. — Тады абавязкова адзначце, што мы ўсе былі надзвычай рады пабываць у вашай краіне, гаварыць з вашымі людзьмі. Мы вельмі задаволены, што атрымалі магчымасць наведаць гэты інтэрнат, сустрэцца з савецкімі геранталагамі. Перад намі, як вучонымі, стаіць пытанне, як прадоўжыць жыццё чалавека. Але цяпер падобнае пытанне паўстае перад усімі людзьмі. Як увогуле захаваць жыццё на планеце? Сёння, калі ў свеце такое напружанне, гэта становіцца галоўнай задачай для чалавецтва. Без вырашэння гэтай праблемы наша работа не мае сэнсу. Таму мы, медыкі, перш за ўсё хочам, каб на Зямлі заўсёды быў трывалы і надзейны мір, і мы рады, што сустрэлі глыбокае разуменне ў вашых урачоў, ва ўсіх савецкіх людзей, з якімі нам давялося сустракацца.

Рыгор ФАМЕНКА.

НА ЗДЫМКАХ: амерыканскія геранталагі ў час наведвання інтэрната ветэранаў вайны і працы.

Фота А. ДАВІДОВІЧА.

НА ПРОСТОРАХ РОДИНЫ

«СКВОЗЬ КАВКАЗ»

С двух сторон Главного Кавказского хребта ведутся работы по прокладке перевальной железной дороги, небольшой по протяженности (всего 188 километров), но уникальной для СССР по сложности. Почти сорок процентов трассы предстоит проложить среди горных круч, под щитом противолавинных и противообвальных галерей, по подпорным стенам, в туннелях, на мостах и виадуках над горными ущельями и реками.

Идея строительства железнодорожной линии через Кавказский хребет родилась еще в прошлом веке. В ее обсуждении принимал участие знаменитый француз А. Эйфель. «Если мою башню называют железным чудом Парижа, то транскавказская магистраль станет железным чудом всего Кавказа», — сказал тогда французский инженер. Однако идея так и не была реализована.

Вернуться к ней в наши дни заставило бурное развитие экономики Закавказья. Достаточно сказать, что только в нынешней пятилетке (1986—1990 годы) промышленное производство в этом обширном регионе возрастет примерно на четверть. Естественно, увеличиваются и объемы железнодорожных перевозок.

Трасса новой железной дороги начнется неподалеку от Тбилиси, столицы Грузинской ССР, пройдет на север по долине горной реки Арагви, параллельно древней Военно-Грузинской дороге. Затем почти на двухкилометровой высоте у местечка Архоти она нырнет в 23-километровый двухпутный туннель под Главным Кавказским хребтом. Из него она выйдет в красивейший каньон бурной Ассы и вскоре приведет в город Орджоникидзе, столицу Северо-Осетинской автономной республики.

На трассе предстоит выполнить огромный объем работ: вынуть более 22 миллионов кубометров грунта, преимущественно в скальных породах, уложить около трех миллионов кубических метров бетона, перекинуть над пропастями и реками 72 моста, соорудить множество подпорных стен, галерей.

Сейчас железнодорожная связь центральных районов страны с Грузией и Арменией осуществляется в обход Главного Кавказского хребта по двум направлениям. Грузовые поезда идут вдоль берега Каспийского моря, через Азербайджан, а пассажирские — вдоль Черного моря. Считая от столицы Грузии Тбилиси, перевальная магистраль сократит протяженность грузовых перевозок на 900 километров и пассажирских — на 300 километров.

Велико значение новой железной дороги и для развития прилегающих к ней труднодоступных районов Кавказа. В придорожной полосе будут сооружены предприятия горной индустрии, появятся зоны массового отдыха, близ многочисленных целебных минеральных источников — санатории.

Ван БАЙБУРТ,
корреспондент АПН.

КАК ДЕЙСТВУЮТ ВРАЧИ ДЛЯ СПАСЕНИЯ ПОСТРАДАВШИХ В ЧЕРНОБЫЛЕ

ПО ЕДИНОМУ ДОЛГУ

— Статистика последствий аварии на АЭС в Чернобыле такова. В первые часы погибли два работника атомной станции, находившиеся в ее здании в ночь с 25 на 26 апреля. 204 человека, дежурившие на станции и тушившие вспыхнувший пожар, подверглись облучению: их немедленно доставили в специализированные клиники. Неделю спустя погиб один больной, 17 находились в тяжелом состоянии. По данным на 15 мая, госпитализировано 299 человек с диагнозом лучевой болезни разной степени тяжести, семь человек скончались, 35 — в тяжелом состоянии. Угроза жизни больных возрастает? — спрашиваю члена-корреспондента Академии медицинских наук СССР Андрея Ивановича ВОРОБЬЕВА.

— Лучевая болезнь имеет свои циклы развития. Чем меньше доза поглощенной лучевой энергии, тем позже возникают (если возникают) ее проявления. Главное из них — опустошение костного мозга, органа кроветворения, создающего лейкоциты и другие клетки крови, которые нейтрализуют агрессию микроорганизмов.

Я хочу, чтобы вы поняли следующее. Когда сообщается, что больной находится в тяжелом состоянии, это значит диагностируется острый период болезни — опустошение костного мозга. Через одну — две недели оно может нормализоваться, но всех находящихся в этом остром периоде мы относим к числу тяжелых больных. Поэтому сведения о состоянии пациентов, точно отражающие существующую ситуацию, меняются день ото дня.

— Какими возможностями располагает медицина в лечении лучевой болезни?

— Специальных средств, которые использовались бы только в терапии лучевой болезни, в мировой медицине нет. Ее лечение принципиально не отличается от того, к которому врачи прибегают, оказывая помощь больным с поражениями системы кроветворения. Например, страдающих лейкозами. Арсенал лечебных средств здесь весьма обширен. В зависимости от стадии заболевания и, конечно, индивидуальных особенностей пациента он включает переливание различных компонентов крови, предупреждение или устранение токсических, септических и иных изменений, возникающих на фоне сниженного иммунитета.

Используются также пересадки донорского костного мозга. Опыт таких пересадок есть. В частности, незадолго до Чернобыльской аварии на заседание кафедры гематологии Центрального института усовершенствования врачей в Москве была приглашена пациентка профессора Баранова, живущая с пересаженным костным мозгом, взятым у ее брата. Профессор Баранов руководит отделением, где проходят лечение пострадавшие в Чернобыле.

— В Москву приезжали американские специалисты, в частности профессора Гейл и Тарасаки. Чем была вызвана необходимость этого?

— В обычное время к пересадкам костного мозга врачи мира прибегают нечасто: здесь много нерешенных проблем. Сейчас возникла необходимость его трансплантации сразу многим больным. Каждый врач понимает, сколь это трудно даже технически, и нет ничего удивительного, что преодолеть трудности нам предложили коллеги из разных стран — не только США, но и Франции, Японии, Италии.

В любом бедствии принято приходить на помощь. Все мы считаем само собой разумеющимся направление медицинских работников, экстренную доставку лекарств, перевязочных материалов в страны, пострадавшие, например, от разгула стихии. Это естественное и необходимое международное сотрудничество.

Профессор Гейл — ведущий специалист США по пересадкам костного мозга. Профессор Тарасаки —автор оригинальных методик по типированию — определению степени совместимости костномозговой ткани. Костный мозг донора должен быть максимально совместим, не вызывать, как все чужое, протеста организма. Словом, пересадки костного мозга — очень трудное дело. Они сделаны девятнадцати нуждавшимся в них больным.

— Я знаю, что сейчас у вас напряженное время, вам необходимо возвращаться к больным. Но позвольте задать еще один вопрос, волнующий сегодня всех. В зоне Чернобыльской атомной станции и даже на ней самой ведутся работы по устранению аварии. В частности, над аварийным зданием станции уже сотни полетов совершили вертолетчики, заглушившие реактор своеобразной подушкой из различных веществ. Возможно ли возникновение у них лучевой болезни?

— Таких случаев не должно быть: пребывание в зоне повышенной радиации строго регламентируется. Известно, что радиация каждодневно воздействует на каждого из нас, не представляя угрозы здоровью. Она возникает, когда дозы радиоактивности превышают определенные нормы. Мы знаем, каковы они, и тщательно следим за тем, чтобы они не превышались. Врачи постоянно проводят медицинские обследования. После работы все (не только вертолетчики) проходят оздоровительное профилактическое лечение, укрепляющее организм.

Элеонора ГОРБУНОВА.
(АПН).

НЮРНБЕРГСКИЙ ПРОЦЕСС: ПОМНИТЬ УРОКИ ПРОШЛОГО

ЧТО НЕС НАРОДАМ «НОВЫЙ ПОРЯДОК»

ВРЕМЯ все больше отдаляет нас от событий второй мировой войны. Но злодеяния немецко - фашистских агрессоров, развязавших ее, все еще напоминают о себе, зовут к бдительности. Правда о преступлениях гитлеровцев во весь голос прозвучала в ходе Нюрнбергского процесса над главными нацистскими военными преступниками, проходившего 40 лет назад (20 XI 1945—1 X 46).

К лету 1941 года под игом нацистской Германии оказались почти все государства Европы. Часть из них гитлеровцы присоединили или намеревались присоединить позже к своей империи. 22 июня фашистская Германия вероломно напала на Советский Союз, и к концу года ее армии захватили Советскую Прибалтику, Белоруссию, Украину, ряд областей Российской Федерации. Как в западных странах, так и на оккупированной советской земле фашисты насаждали свой «новый порядок». Суть его — порабощение независимых государств, истребление целых народов, установление мирового господства.

В условиях «нового порядка» вся европейская экономика была превращена в придаток немецко-фашистской военной машины. Из оккупированных стран в Германию вывозилось огромное количество оборудования, сырья и продовольствия. Из Франции, например, было вывезено промышленных изделий более чем на 184 миллиарда франков. В Чехословакии фашисты захватили различных материальных ценностей на сумму 200 миллиардов чешских крон. Из Советского Союза они отправили в Германию 9,2 миллиона тонн зерна, 3,2 миллиона тонн картофеля, 622 тысячи тонн мяса и мясных продуктов, 420 тысяч тонн сахара, а также большое количество железной руды, станков, хлопка, шерсти и других материалов.

Из захваченных стран в Германию фашисты насильственно вывезли миллионы людей. К концу сентября 1944 года численность иностранных рабочих и военнопленных составила свыше 26 процентов всей рабочей силы, занятой в экономике Германии. Только с оккупированной территории СССР было угнано около 5 миллионов человек, из Чехословакии — 750 тысяч, из Голландии — почти 500 тысяч, из Бельгии — 190 тысяч человек.

Широкий размах получило разграбление произведений искусства. Как свидетельствуют материалы Нюрнбергского процесса, из СССР, Польши, Австрии, Чехословакии, Венгрии и Балканских стран гитлеровцы вывезли по меньшей мере 200 тысяч предметов искусства. На процессе было отмечено, что художественные ценности, присвоенные нацистской Германией в годы господства «нового порядка» в Европе, превосходят все сокровища Метрополитен-музея в Нью-Йорке, Британского музея в Лондоне, Лувра в Париже и Третьяковской галереи в Москве.

Установление «нового порядка» в Европе сопровождалось массовыми убийствами. Стремясь запугать население и заставить его отказаться от борьбы, фашистские захватчики ввели систему коллективной ответственности и заложничества. За любой акт, враждебный оккупантам, на все население данной местности накладывалась контрибуция. За убийство военнослужащего оккупационной армии или представителя оккупационных властей расстреливались десятки и сотни заложников, сжигались вместе с людьми целые населенные пункты. Любой чиновник оккупационного аппарата, эсэсовец или гестаповец, офицер или солдат был «законодателем» и «судьей». Вся захваченная фашистами территория была покрыта сетью концлагерей и гетто.

Колючая проволока концлагерей и дымящие трубы крематориев стали символами фашистского «нового порядка» в Европе. В лагерях действовал принцип: изнурительный труд при минимальном количестве пищи и полное отсутствие медицинской помощи. Миллионы людей погибали от голода, болезней, непосильной работы.

Из фашистских концлагерей самым ужасным была фабрика смерти на территории Польши, в Освенциме. Созданная в мае 1940 года, она постепенно превратилась в целый концерн из 39 лагерей. Используя даровую рабочую силу, немецкие монополии Круппа, Сименса и другие организовали здесь свои производства и получали небывалые в истории прибыли. По свидетельству узников Освенцима, продолжительность жизни заключенных, работавших на этих предприятиях, не превышала двух месяцев: через каждые две-три недели производился отбор, и всех ослабевших отправляли в газовые камеры и крематории. Тех, кто падал от изнеможения в процессе работы, расстреливали здесь же, на месте.

Ежедневно в Освенцимском лагере эсэсовцы умерщвляли и сжигали от 10 до 12 тысяч человек. С целью получения прибыли лагерные власти организовали переработку человеческих костей на удобрения. В промышленных целях использовались также волосы, срезанные у женщин, предназначенных к уничтожению. После освобождения Освенцимского лагеря на его кожевенном заводе было обнаружено 293 тюка запакованных женских волос общим весом 7 тысяч килограммов. Экспертная комиссия в марте 1945 года установила, что волосы срезаны со 140 тысяч женщин. Все это было предъявлено в Нюрнберге суду в качестве вещественных доказательств.

Свыше 12 миллионов мужчин, женщин и детей из европейских стран было истреблено в фашистских лагерях смерти, в том числе 4 миллиона человек — в Освенциме, 1,5 миллиона — в Майданеке, сотни тысяч — в застенках Бухенвальда, Дахау, Заксенхаузена, Маутхаузена...

Лишь разгром фашизма во второй мировой войне, решающий вклад в который внес Советский Союз, покончил с «новым порядком» в Европе, не дал ему распространиться на весь мир.

Кое-кто на Западе считает, что не стоит ворошить тяжелое прошлое. Нет. Фашистским преступникам и их пособникам не может быть прощения. В «Декларации о поражении Германии» от 5 июня 1945 года указывается, что арест и выдача военных преступников, творивших кровавые злодеяния в захваченных странах, должны производиться «в любое время». Это значит, что на них не распространяется срок давности. Однако многим, очень многим военным преступникам удалось уйти от возмездия. Подавляющее большинство из них покрываются властями США, которые под различными предлогами тормозят их выдачу странам, где они совершили преступления.

Люди не должны забывать о злодеяниях фашистских агрессоров. Правда о их преступлениях против человечества должна сохраняться в памяти народов, особенно молодежи. Это нужно для того, чтобы не допустить повторения подобного в будущем.

Анатолий ЯКУШЕВСКИЙ,
полковник, кандидат исторических наук.
(АПН).



Город Горки — один из районных центров Могилевской области. Он хорошо известен тем, что здесь находится Белорусская сельскохозяйственная академия — главная кузница специалистов с высшим образованием для сельского хозяйства республики. В Великую Отечественную войну город был почти полностью разрушен и опустошен. После изгнания фашистов отстроился заново, похорошел. Здесь беспрерывно ведется промышленное, культурное и социальное строительство. Вот и недавно был открыт новый комбинат общественного питания, в котором есть ресторан, кафе, молочный бар, магазин кулинарии.

НА СНИМКЕ: комбинат общественного питания в Горках.

Фото Н. ЖЕЛУДОВИЧА.

АЛЯКСАНДР АСТРОЎСКІ — ЗАСНАВАЛЬНІК РУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ТЭАТРА

МАГУТНАСЦЬ ТАЛЕНТУ

АЛЯКСАНДР Астроўскі — адзіны рускі класік, які пісаў выключна для тэатра. Ён аўтар сарака сямі п'ес, якія доўгія гады вызначалі рэпертуар рускай сцэны.

Дзяцінства і юнацтва, праведзеныя ў старым купецкім раёне Масквы — Замаскварэччы, работа ў Маскоўскім камерцыйным судзе давалі будучаму драматургу багаты матэрыял для назіранняў, падказвалі сюжэты. Адной з замалёвак Астроўскі надаў закончаны выгляд п'есы і асмеліўся прачытаць яе публічна. Адбылося гэта 14 лютага 1847 года. Астроўскі лічыў гэты дзень самым памятным у сваім жыцці. «З гэтага дня, — пісаў ён, — я стаў лічыць сябе рускім пісьменнікам і ўжо без сумненняў і ваганняў паверыў у сваё прызванне». Што дало яму такую ўпэўненасць? Безагаворачнае прызнанне прысутнымі яго таленту. Усё падабалася ім у яго невялікай п'есе «Карціна сямейнага шчасця»: вастрыня погляду на жыццё, яркія вобразы купцоў, якія да яго на рускай сцэне ўвогуле не з'яўляліся, выдатная, жывая мова.

Аднак цэнзура, куды Астроўскі, натхнёны поспехам, аддаў сваю п'есу, знайшла ў ёй нешта абразлівае для купецтва і да прадстаўлення не дапусціла. Па той жа прычыне была забаронена і наступная камедыя драматурга — «Банкрут». Тады Астроўскі і Садоўскі (вядучы артыст у трупе Малога тэатра) сталі чытаць яе ў розных маскоўскіх дамах. Камедыя мела выключны поспех. Яе называлі «купецкімі» «Мёртвымі душамі», ставілі побач з гогалеўскім «Рэвізорам». «Банкрута» слухалі Гогаль і малады Леў Талстой... У 1850 годзе п'есу ўдалося апублікаваць у «Москвитянине», але дазволу на яе пастаноўку не давалі. Астроўскі працягваў пісаць, кожны год з'яўлялася новая п'еса. За пяць год — пяць п'ес. І пяць кароткіх заключэнняў цэнзурнага камітэта: «Забараніць».

Але артысты хацелі іграць у п'есах Астроўскага, асабліва Садоўскі і Нікуліна-Касіцкая — прэм'еры Малога тэатра. У творах драматурга яны бачылі магчымасць раскрыць у поўную сілу свае таленты. Нікуліна-Касіцкая настойліва старалася паставіць чарговую камедыю Астроўскага ў свой бенефіс. Нарэшце, яе намаганні ўвянчаліся поспехам: актрысе дазволілі сыграць меладраму «Не ў свае сані не садзіся», 14 студзеня 1853 года, калі прэм'ера прайшла з трыумфам, стала знамянальным днём у гісторыі рускага тэатра, з'явіўшыся пачаткам сцэнічнай гісторыі п'ес Астроўскага.

Дарога на падмосткі п'есам Астроўскага была адкрыта. Ужо праз год у Малым тэатры іграліся камедыя «Беднасць не загана», яшчэ праз год — «Не так жыві, як хочацца». З таго часу кожны сезон на сцэне дэбютавала адна, а то і дзве п'есы драматурга.

Яны выклікалі розныя да сябе адносіны — ад захаплення да рэзкага непрыняцця. Гэта было натуральна. Астроўскі пачынаў новую эпоху ў драматычным мастацтве, вакол яго ішла барацьба старога і новага, аджыўшага і якое толькі нараджалася. У яго п'есах усё было нязвыкла: новыя героі з купецкага асяроддзя з яго бязглуздымі і жорсткімі законамі, якія зневажалі чалавечую годнасць; звычайная абстаноўка; сапраўды народная мова, што адпавядала характарам персанажаў; спалучэнне ў адной і той жа п'есе драматычных і камедыйных элементаў, якое парушала традыцыйнае жанравае дзяленне.

Адным з вышэйшых дасягненняў творчасці драматурга стала яго п'еса «Навальніца». Вялікі рускі крытык Мікалай Дабралюбаў назваў яе «самым рашучым творам Астроўскага». Іван Тургенеў — «надзвычайным, цудоўным творам рускага магутнага таленту, які цалкам авалодаў сабой». А Іван Ганчароў прадказаў, што гэта п'еса «доўга будзе займаць першае месца па класічных вышынях».

Такая ацэнка «Навальніцы» звязана была перш за ўсё з вобразам галоўнай гераіні — Кацярыны, маладой жанчыны, якая выступіла супраць патрыярхальных устояў. Аўтар убачыў у ёй «павевы новага жыцця», характар моцны, адважны, самабытны, які лепш выбірае смерць, чым хатняе рабства, і тым самым сцвярджае свабоду і годнасць асобы.

У другой выдатнай п'есе Астроўскага — «Даходнае месца» ў выкрывальную арбіту пісьменніка ўключалася асяроддзе чыноўнікаў з яго законам кругавой парукі і пагоняй за кар'ерай. Вастрыня канфлікту і вобразаў — не толькі характараў, а сацыяльных тыпаў, выкрывальны пафас — усё было адзначана магутнасцю выдатнага і сталага таленту.

Новы ўзлёт у творчасці Астроўскага прыпадае на канец 60—70-х гадоў, калі ён напісаў такія творы, як «На ўсякага мудраца хапае прастаты», «Гарачае сэрца», «Ваўкі і авечкі», «Шалёныя грошы», «Лес». Драматург паўстаў супраць жыцця, амаральнага сваёй бязмэтнасцю, дарэмнасцю, процінастаўляючы яму людзей з «гарачымі сэрцамі», якія смела выступаюць супраць самадурства, улады грошай, што ператвараюць людзей у маральных выродкаў.

У гэтых п'есах Астроўскі працягвае традыцыі рускіх пісьменнікаў — Фанвізіна, Грыбаедава, Гогаля, а ў апошні перыяд жыцця ён стварае творы, якія можна назваць папярэднікамі чэхаўскіх, — гэта «Беспасажніца», «Таленты і паклоннікі», «Без віны вінаватыя», «Позняе каханне».

Усе п'есы Астроўскага ставіліся на сцэне маскоўскага Малога тэатра, у бенефісы акцёраў, для якіх яны часта і пісаліся, і ў Аляксандрынскім тэатры ў Пецярбургу. На гэтай драматургіі вырасла многа выдатных артыстаў, творчасць якіх азнаменавала новы этап у развіцці рускай акцёрскай школы. Віншуючы драматурга з 35-годдзем творчай дзейнасці, выдатны рускі пісьменнік Ганчароў адзначаў: «...толькі пасля вас мы, рускія, можам з гордасцю сказаць: у нас ёсць свой рускі нацыянальны тэатр».

Астроўскі быў не толькі драматургам, але і рэжысёрам сваіх п'ес. Ён падрыхтаваў мноства запісак па рэарганізацыі рускага тэатра і стаў адным са стваральнікаў «Артыстычнага гуртка» — першага творчага аб'яднання расійскіх акцёраў і першай акцёрскай школы ў Расіі. Сам Астроўскі выкладаў у ёй майстэрства акцёра.

Наватарская прырода драматургіі Астроўскага з'яўляецца асновай таго, што на ўсіх этапах абнаўлення грамадскага жыцця тэатр звяртаецца менавіта да яе. Так, «Гарачае сэрца» дало Станіслаўскаму матэрыял для стварэння на сцэне Маскоўскага Мастацкага тэатра спектакля, у якім вялікі рэжысёр выказаў дух рэвалюцыйнай эпохі.

У апошнія гады на савецкай сцэне пачалося як бы новае адраджэнне Астроўскага. Адзін за адным з'яўляюцца спектаклі, дзе драматург становіцца субяседнікам сучаснага чалавека, памагае яму разабрацца ў складаных праблемах часу. Цяжка знайсці сёння тэатр у СССР, афішу якога не ўпрыгожвала б тая ці іншая п'еса Астроўскага. Вядучыя рэжысёры Георгій Таўстаногаў, Алег Яфрэмаў, Андрэй Ганчароў не раз звярталіся да драматургіі Астроўскага. Толькі зусім нядаўна на сцэне Ленінградскага Вялікага драматычнага тэатра адбылася прэм'ера спектакля па яго п'есе «На ўсякага мудраца хапае прастаты». Сцэнічнае жыццё п'ес Астроўскага працягваецца.

Валянціна РЫЖОВА.





ВЫСТАЎКА Ў ПОЛЬШЧЫ

У Польскай Народнай Рэспубліцы прайшлі Дні Беларускай ССР. З гэтай нагоды ў Варшаве адбылося адкрыццё выстаўкі «Эканоміка, навука і тэхніка Беларускай ССР», якая расказала аб дасягненнях рэспублікі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Перад польскімі гледачамі выступілі таксама танцавальны ансамбль «Маладосць» з Віцебска і вакальна-інструментальны калектыў «Чараўніцы» з Мінска. Прыхільнікі ж выяўленчага мастацтва мелі магчымасць пазнаёміцца з творчасцю вядомага мастака Міхаіла Савіцкага. Невялікая экспазіцыя, якая складалася ўсяго з 19 работ, выклікала вялікую цікавасць наведвальнікаў. У ёй былі прадстаўлены карціны розных перыядаў: «Дзяўчына з капустай», «Жаночы партрэт», «Партрэт мастака Гаўрыленкі», «Ільнаводы», «Рабочыя», «Куст руж», «Хлеб», «Партызанская мадонна» [мінская], «Камсамольцы», «Дзеці вайны», а таксама творы, выкананыя апошнім часам.

Адна з такіх работ беларускага мастака — трыпціх «Агрэсія» стала сэнсавым цэнтрам усёй экспазіцыі. У ёй з публіцыстычнай страснасцю выкрываецца звярыная сутнасць злачынстваў імперыялізму XX стагоддзя — фашыстаў розных масцей.

У. ПРАКАПЦОЎ.

НА ЗДЫМКАХ: М. САВІЦКІ. «Партрэт Я. Купалы»; «Агрэсія II» [цэнтральная частка трыпціха]; «Куст руж».

Фота аўтара.

ПЛЁН БЯСКОНЦЫХ ДАРОГ

На рахунку вядомага беларускага фалькларыста Зінаіды Мажэйкі ўжо не адзін дзесятак грунтоўных навуковых прац. Дастаткова прыгадаць хаця б такія, як «Песенная культура беларускага Палесся. Сяло Тонеж», «Песні беларускага Паазер'я». Гэтыя кнігі па праву занялі сваё месца ў скарбніцы нацыянальнай культуры.

У канцы мінулага года ўбачыла свет новая праца З. Мажэйкі — кніга «Каляндарна-песенная культура Беларусі», у якой найбольш поўна раскрылася багатая палітра даследчыка.

Зінаіда Мажэйка доўгія гады самааддана працуе на карысць навукі. За 20 гадоў нястомны збіральнік народных скарбаў запісала больш за пяць тысяч узораў толькі каляндарных песень. Музычная культура вусна-паэтычнай народнай творчасці асабіста фалькларыстам даследавана шматпланава ў 18 вёсках, пяці дыялектных зонах: Тонеж, Букча, Глушкавічы, Дзяржынск, Азершчына, Чырвонае Возера (гомельскае Палессе); Клетня, Гольцы, Лугі, Вялемічы, Тышковічы (брэсцкае Палессе); Аношкі, Сталюгі, Замошша, Канчаны, Латыголь (Паазер'е); Усполле (Магілёўшчына); Зачэпічы (Гродзеншчына).

Не паглыбляючыся ў тэарэтычна-музычныя аспекты апошняй работы З. Мажэйкі, хочацца адзначыць высокую прафесійную культуру аўтара. Даследчык аперыруе вельмі багатым матэрыялам, ёю зроблены карты, дзе паказаны тэрыторыі распаўсюджання тыпавых напеваў, табліцы і схемы. З. Мажэйка ўдзяляе ўвагу не толькі агульнатэарэтычным пытанням, але і пытанням грамадскага характару. Так, яна разглядае, у якой ступені каляндарна-земляробчая песенная традыцыя вызначае музычны быт сучаснай вёскі і якая функцыянальная нагрузка каляндарных песень у наш час; спрабуе прааналізаваць «жыццёвыя сілы» каляндарна-земляробчай песні і яе далейшы патэнцыял.

Манаграфія З. Мажэйкі пакіне прыкметны след у вывучэнні як старажытнага пласта народнай творчасці, так і фальклору наогул. Яна будзе карысная як для спецыялістаў, так і для ўсіх, хто цікавіцца культурай Беларусі.

Алесь ЛОЗКА.

ДОБРЫ ПАЧАТАК

Дзесяць дзён гасцяваў у Віцебску ў Акадэмічным тэатры імя Якуба Коласа першы «Беларускі тэатральны фестываль» — агляд рэспубліканскіх драматычных калектываў.

Дзевяць сцэнічных твораў было прадстаўлена на фестывалі. Сярод іх прызнаныя гледачом, высока ацэненыя крытыкай, вядомыя за межамі рэспублікі «Вечар» А. Дударава ў пастаноўцы коласаўцаў і версія тэатра імя М. Горкага аповесці В. Быкава «Знак бяды». Аснову ж афішы гэтых дзён склалі спектаклі па першых драматургічных вопытах А. Жука, В. Ткачова, А. Кудраўцава, В. Іпатавай... Дэбютаваў на віцебскай сцэне і цэлы калектыў — Дзяржаўны маладзёжны тэатр БССР.

На заключнай канферэнцыі «Беларускага тэатральнага фестывалю» з дакладамі выступілі вядомыя беларускія мастацтвазнаўцы. У творчай дыскусіі прынялі ўдзел рэжысёры, акцёры, драматургі з тэатраў дэспублікі.

НАРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫІ

Непаўторны майскі дзень... Плыве ў паветры цёплы пах бэзу, што адцвітае ў скверах, быццам ашалелыя, носяцца галубы і вераб'і, а неба блакітнае, яснае, чыстае. Сама прырода спрыяе нашаму святу.

З усіх канцоў горада збіраюцца ў цэнтр, да плошчы Перамогі, людзі. Сёння адсюль будзе дадзены старт спартыўнай эстафеце ўсіх раёнаў Мінска. Сцішыліся машыны, уступіўшы сваё месца на магістралях вірліваму натоўпу. Родны і мілы горад, сёння ты такі светлы і прыгожы, што хочацца прызнацца табе ў любві!

Я ўглядаюся ў твары тваіх жыхароў: праносяцца чародкамі дзяўчаты ў яркіх адзеннях — гэта студэнткі, важна шпацыруюць маладыя бацькі з немаўляткамі ў калясках, тупаюць ножкамі маленькія чалавечкі, юныя грамадзяне сталіцы, моцна трымаючы адзін аднаго за руку, праплываюць улюбёныя парачкі, праходзяць сівыя бабулі і дзяды, ідуць ветэраны вайны і працы з медалямі на ўсе грудзі — перад імі пачціва расступаецца натоўп. Працай усіх гэтых людзей квітнее беларуская сталіца. Старэйшыя памятаюць свой Мінск іншым, не такім, як сёння — радасным і шчаслівым, а абгарэлым, зруйнаваным вайною. Людзі памятаюць усё: і старажытную Нямігу, дзе палажылі свае галовы ў барацьбе з ворагам іх далёкія продкі, і салют Перамогі

9 мая 1945 года... Людской памяццю, пераемнасцю пакаленняў рухаецца гісторыя. І сёння, у дзень свята свайго горада, адзінае пачуццё агортвае ўсіх мінчан — пачуццё гордасці за свой мужны горад, пачуццё далучанасці да вялікіх спраў народа.

...Роўна ў 11 гадзін фанфары абвясцілі пачатак свята. І закруцілася карусель карнавала, дзе вядучыя Несцерка і Паўлінка.

— Гэй, народ, хопіць спаць, паспяшайся гуляць! — пакрыкваюць, як некалі ў час народных гулянняў, зазывалы, ролю якіх з поспехам выконваюць артысты самадзейных тэатраў.

— А калі гуляць сабраўся, то пад'есці не забудзь,—як з-пад зямлі вырастаюць хлопцы-гандляры, што прапануюць жадаючым абаранкі, зробленыя па старому рэцэпту, цукеркі, булкі.

Чаго толькі не ўбачыш сёння ўздоўж набярэжнай Свіслачы! Вось побач з Палацам спорту ўзнялася, як гаспадыня свята, вялізная лялька — кабета ў нацыянальным адзенні. Людзі побач з ёй здаюцца маленькімі. Вабіць да сябе і жоўты шацёр-капялюх. Пад яго дахам размясціўся своеасаблівы выставачны павільён — цэнтр «Кірмашу рамёстваў». А на кірмашы сабраліся славутыя майстрыхі - саломапляцельшчыцы, ткачыхі, ганчары, разьбяры. Кожны заняты сваёй справай: тчэ ручнік ці круціць на крузе глечык. Абступіла дзядзькоў-ганчароў з усіх бакоў моладзь, з цікавасцю сочыць за кожным іх рухам. Ды і не дзіва — можа быць, упершыню гараджанам даводзіцца бачыць майстра за справай. Ды дзядзькі за словам у кішэню не палезуць, а то яшчэ і кпін якіх падкінуць. Маўляў, чаго зыркаць і дзівіца, калі можна сесці і самому зрабіць нешта з гліны. Смельчакі, як заўсёды, знаходзяцца. Але выраб такі — на пацеху народу. Гліна, хоць і мяккі матэрыял, але руку майстра чуе.

Безупынна рухаецца ўздоўж набярэжнай Свіслачы натоўп.

У гандлёвых радах прадаецца столькі ўсялякіх рэчаў... На ўсеагульны агляд выставілі зробленыя з самых розных матэрыялаў цацкі і ўпрыгажэнні выхаванцы школы № 26 (з мастацкім ухілам). Тут жа, пад адкрытым небам, размясціліся і іх невялікія майстэрні.

Але доўга на адным месцы нельга затрымлівацца: не паспеш убачыць чагосьці іншага, таксама цікавага. Трэба спяшацца і нам, хоць і шкада пакідаць праспект, дзе пачуеш гукі старажытных беларускіх інструментаў, убачыш арыгінальныя нацыянальныя танцы ў выкананні ўжо вядомых і яшчэ маладых ансамбляў.

Дзесяць хвілін засталося да пачатку сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі і паэтамі ў парку імя Янкі Купалы, які стаў падчас свята паркам мастацтваў. Дзесяць хвілін хопіць, каб пешкі з праспекта Машэрава хуткай хадой прайсціся да парку.

...Гойдаюцца на ціхіх водах Свіслачы вялізныя вянкі з рознакаляровых кветак, а паміж імі, дэманструючы сваё майстэрства, на байдарках праплываюць юныя спартсмены, выхаванцы спартыўных школ.

У парку мастацтваў пад засенню дрэў можна трохі і пе-

(Заканчэнне на 8-й стар.).

НА ЗДЫМКАХ: ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця свята «Мінск-86» прынялі ўдзел ганаровы грамадзянін горада, заслужаны майстар спорту СССР, трохразовы алімпійскі чэмпіён, семіразовы чэмпіён свету, заслужаны дзеяч фізічнай культуры БССР А. МЯДЗВЕДЗЬ, зваршчыца вытворчага аб'яднання «Інтэграл» дэпутат Вярхоўнага Савета СССР Г. ШЛАПАКОВА, мадэльшчык вытворчага аб'яднання «Мінскі трактарны завод імя У. І. Леніна» дэлегат XXVII з'езда КПСС Ю. ВАХРОМІН; выстаўка аднаго дня на набярэжнай Свіслачы; разам са сваімі вырабамі на «Кірмаш рамёстваў» народныя майстры слуцкай фабрыкі мастацкіх вырабаў Т. БЕЛАУСАВА і Н. ПАЎЛАВА прывезлі і прылады працы — свае кросны. Цікаўныя маглі паглядзець, як ткуцца самабытныя ручнікі, посцілкі, дываны.

НАШ КАЛЯНДАР

БАРЫСУ САЧАНКУ—50 ГАДОЎ

Вядомаму беларускаму празаіку Барысу Сачанку споўнілася пяцьдзесят год, узрост творчай і жыццёвай сталасці.

Нарадзіўся пісьменнік у вёсцы на Гомельшчыне ў сям'і рабочага. Шмат гора і няшчасця зведаў ён у дзяцінстве: у чэрвені 1943 года разам з бацькамі быў вывезены ў Нямеччыну, адкуль вярнуўся ў 1945-м.

У 1960 годзе скончыў Белдзяржуніверсітэт, затым працаваў у часопісе «Полымя», выбіраўся сакратаром Саюза пісьменнікаў БССР.

Першае апавяданне Барыс Сачанка надрукаваў у 1956 годзе. З таго часу, вось ужо трыццаць год, ён адзін з актыўных беларускіх пісьменнікаў. Яго пяру належаць шматлікія апавяданні, аповесці, раманы. У 1981 годзе выйшлі выбраныя творы Б. Сачанкі ў 2-х тамах. Ва ўсіх сваіх работах празаік паказвае сябе добрым знаўцам народнага жыцця і побыту, тонка адчувае багацце і прыгажосць роднай мовы.

Шмат робіць Барыс Сачанка для папулярызацыі сярод беларускіх чытачоў лепшых дасягненняў іншых літаратур. Ён быў складальнікам выбраных твораў Я. Івашкевіча, Я. Гушчы, М. Булгакава, двухтомнай анталогіі рускага савецкага апавядання.

Неаднаразова кнігі самога пісьменніка выходзілі ў маскоўскіх выдавецтвах, перакладаліся на мовы братніх рэспублік і на замежныя мовы.

У 1982 годзе за кнігу прозы «Ваўчыца з Чортавай Ямы» Барысу Сачанку была прысуджана Дзяржаўная прэмія БССР імя Якуба Коласа.

З НОВЫХ ВЕРШАЎ

Рыгор БАРАДУЛІН

ДЗЕНЬ ДОБРЫ

Зірнуць хацеў бы на стагі я,
Што пад дажджамі парудзелі.
Дзень добры,
Пані настальгія —
Абранка смутку і надзея.

Ты — ўзрушлівая гаспадыня
Яго няўлоўнасці настрою,
Здалёк ідзеш у пыле, ў дыме,
Каб вока выслезіць кастрою

З таго дагодлівага лёну,
Што помніць сцелішча на лузе,
Дзе наплываў туман з адхону
На светлае чало ілюзій.

Я ўсё лічыў,
Ты — здань,
Ты — мроя,
А ты — спрадвечная, жывая.
Не сыдуцца гара з гарою,
Твая ж іголка ўсё сшывае:

Пагляд і неба,
Зоры й долы,
Каб на душы заскробся верад,
Каб, як яджгур, настрой вясёлы
На міг парваў
Чужыны нерат.

Не томішся ні ў падарожжы,
Ні ў часе,
Што схацеў спыніцца,
З маладзіковага двухрожжа
Самоты сумная двайніца.

Цябе шануюць дні благія,
Яны твае —
Адчай і дзіва.
Пакуль караеш,
Настальгія,
Датуль жыве ў душы Радзіма!

Я ПАСЫЛАЮ СНЫ ЗА АКІЯН

Я пасылаю сны за акіян,
Каб, паблукаўшы па маіх мясцінах,
Яны масты ўспамінамі масцілі
З прымоўклых рэк,
З зажураных палян.
Я пасылаю сны за акіян.
Прашу Гудзон
Не слаць мне гуд у сон,
Хачу хоць трохі адпачыць ад гуду.
З забытай цішай ростань перабуду
І зноў вярнуся да знаёмых дзён.

Прашу Гудзон
Не слаць мне гуд у сон.
Няхай ідуць, пабыўшы дома, сны,
Нясуць з сабой маіх аблок развагу,
Абгоняць неспакою калымагу
І возьмуць раўнавагу ў баразны.

Няхай ідуць, пабыўшы дома, сны,
Ты мне са снамі дасылай лісты,
Яны спакон ідуць хутчэй за пошту,
Без мыты за давер,
Па сабекошту,
Прагнаўшы недаверу змрок густы.
Ты мне са снамі дасылай лісты.
Чуваць, як сны ідуць,—
Дрыжаць масты...

ЗЯМЛЯЧЦЫ

Хмурынцы з Ушаччыны

Зачапілася за небаскроб
Збеглая з маіх азёр хмурынка.
Досвітку ачахлая жарынка
Астудзіла неспакою лоб.

Дзякуй,
Што мяне і тут знайшла,
З Вечалля напіўшыся,
Зямлячка!
Можа, вочы туманком замгляцца —
Толькі ад зялёнага святла.

Што ўзышло за Доўжыцай вясной
І трывае аж да снегавею.
Як табе, ўшачанка, па Брадвеі
Захацелася прайсці адной,

Я не заблудзіцца памагу,
Подручкі
На зайздрасць небаскробам
Пройдземся,
На злосць наіўным спробам
Наганяць зялёную тугу.

А пасля ў дарогу правяду,
Паплывеш,
Ад сонца залатая,
Я амаль па-ўшацку запытаю
Рэхам наўздагон:
— Хаў ду ю ду!

Застамося сумаваць адны —
Твой зямляк
І небаскробаў скалы.
Толькі не растань,
Прашу ласкава —
Даплыві да ўшацкай стараны!

НАРАДЖЭННЕ ТРАДЫЦЫІ

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.).

радыхнуць, палюбавацца на выстаўленыя ўздоўж набярэжнай карціны. Выстаўка невялікая — у ёй 60 твораў. Ідзе бойкі гандаль творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Наогул, свята дае сёння магчымасць убачыць разам дзеячаў розных відаў мастацтва і літаратуры. Пры жаданні можаш пагутарыць з народным мастаком СССР Міхаілам Савіцкім, або з народным пісьменнікам Беларусі Васілём Быкавым, ці атрымаць кнігу з аўтографам аўтара.

Аднак і тут нельга марудзіць. Асабліва тым, хто прыйшоў на свята з дзецьмі. Ім яшчэ трэба будзе прайсці «Дарогамі творчасці» ў парку Горкага. Галоўны рэжысёр дзіцячай праграмы свята Пётр Гуд задумаў усё так, каб госці былі і гледачамі, і адначасова паўнапраўнымі ўдзельнікамі разнастайных спаборніцтваў, конкурсаў і віктарын. Каб усюды паспець, больш убачыць, можна было сесці ў казачны поезд творчасці, які дастаўляў дзяцей на станцыі Дзяцінства, Заалагічная, Тэхнічная, Спартыўная, Мастацтва і Карнавальная.

Вялікае тэатралізавана-спартыўнае прадстаўленне на стадыёне «Дынама» завяршыла агульнагарадское свята.

Па зялёнаму полю стадыёна ўрачысты круг робяць жыхары самага дружнага дома сталіцы, перадавая брыгада метрабудаўцаў, ткачых, трактарабудаўнікоў... Над імі ў вечаровым небе рассыпаецца гронкамі каляровых зорак салют.

...Цудоўны майскі дзень ужо стаў гісторыяй. Роўна праз год свята паўторыцца.

Таццяна АНТОНАВА.



НА ЗДЫМКАХ: у гарачы дзень лепшы ласунак для малых — марожанае, а дарослыя могуць пакатацца на лодках.

Фота С. КРЫЦКАГА.

ЗНАЧОК ДА ЗНАЧКА...

— Клубы па інтарэсах? перапытала мяне загадчыца культурна - масавага цэнтра Палаца культуры Мінскага трактарнага завода В. Шэіна. — Ёсць, вядома! І маладой сям'і, і жанчын... Заўтра ў дзве гадзіны сустрэча калекцыянераў значкоў — членаў клуба «Фалерыст»...

Я вырашыла пайсці да фалерыстаў.

...Вакол сталоў з калекцыямі — цэлае стоўпатварэнне. Крыху пазней даведалася, што гэта не калекцыі, а «абменны фонд» — тое, што прызначана для абмену. На адным са сталоў — набор значкоў, прысвечаных камсамолу. А вось — серабрыстыя, як лёд, значкі «Савецкі хакей. Чэмпіянаты свету і Еўропы».

— Між іншым, у мяне самая вялікая ў рэспубліцы калекцыя па хакею,— пазнаўшы ва мне клубнага нязнайку, з гонарам паведаміла маладая гаспадыня гэтага збору, слесар-электрык Люба Абразумава. Яна ўжо сабрала дзве тысячы значкоў, прысвечаных папулярнай ігры.

З геральдыкі, са збірання значкоў з адлюстраваннем гербаў гарадоў пачынаў калекцыянер Пётр Букліс, старшыня савета клуба. Некалі яму падарылі да свята набор значкоў, прысвечаных гарадам Смаленшчыны. З таго ўсё і пайшло... Сёння ў П. Букліса — калекцыі па дваццаці чатырох тэмах. Гэта — шаснаццаць тысяч маляўнічых адлюстраванняў, якія многае могуць расказаць чалавеку.

Супрацоўнік Белдзяржуніверсітэта Васіль Станкевіч, з якім я пазнаёмілася ў клубе, ужо два дзесяткі год збірае значкі, прысвечаныя Савецкай Арміі. Асабліва цяжка сёння папаўняць калекцыю з тых далёкіх год, гераічных год Рабоча-сялянскай Чырвонай Арміі... Васіль Кузьміч прызнаўся:

— Нядаўна ўдалося набыць значок аж з дваццаць дзевятага года, прысвечаны падзеям на Кітайска-Усходняй чыгунцы. Быў на сёмым небе ад шчасця.

У намесніка начальніка аддзела Беларускага ўпраўлення грамадзянскай авіяцыі А. Яновіча падобная выстаўка ўжо была — да аднаго з прафесійных святаў Алег Іванавіч паказаў у Мінскім аэрапорце значкі па гісторыі развіцця авіяцыі. Як самую цікавую кнігу разглядалі яго калекцыю саслужыўцы.

— Думаю, карысць ад нашага клуба — не толькі яго членам, — гаворыць А. Яновіч. — Вось, напрыклад, у экспазіцыю музея авіяцыі ў падмаскоўным горадзе Мініна ўвайшоў дар аднаго з нашых таварышаў — прысвечаная авіяцыі калекцыя былога ваеннага інжынера Партнова. А ўвогуле ў нашага «Фалерыста» васемнаццаць падшэфных музеяў. Дапамога ім агаворана ў статуце клуба.

І. СІМАНАВА.

У ВАШУ КАЛЕКЦЫЮ

ПРЫСВЕЧАНЫ ПЕРШАДРУКАРУ

Нядаўна споўнілася 475 год з дня нараджэння Івана Фёдарава, заснавальніка кнігадрукавання ў Расіі і на Украіне. Гісторыя пакінула нам мала звестак і дакументаў аб першадрукару.

І сакавіка 1564 года ён разам са сваім сябрам, выхадцам з Беларусі Пятром Мсціслаўцам, скончыў работу над «Апосталам» — першай ясна датаванай маскоўскай друкаванай кнігай. Ад гэтай даты ідзе афіцыйны адлік пачатку кнігадрукавання ў Расіі. Савецкая пошта неаднаразова прысвячала Івану Фёдараву свае выпускі. Раскажам аб некаторых з іх.

У сакавіку 1964 года было ўрачыста адзначана 400-годдзе рускага кнігадрукавання. Да юбілею было выдадзена дзве маркі. На адной з іх адлюстраваны Іван Фёдараў у той момант, калі ён наносіць фарбу на друкарскую форму. На другой — помнік Івану Фёдараву ў Маскве. На марцы гэты манумент паказаны на фоне сучасных савецкіх газет і часопісаў. Да юбілею былі падрыхтаваны таксама два мастацкія канверты з тэкстам «400 год кнігадрукавання ў Расіі». Неўзабаве пасля выдання славутага «Апостала» Іван Фёдараў вымушаны быў пакінуць Маскву, апасаючыся праследаванняў з боку рэакцыйных царкоўных вярхоў, і паехаў у Вялікае княства Літоўскае. Тут, у мястэчку Заблудава каля Беластока, у замку гетмана Г. Хадкевіча, пачаў працаваць друкарскі станок. Пры ўдзеле Івана Фёдарава была заснавана бібліятэка Віленскага універсітэта, 400-годдзе якой адзначана ў 1970 годзе выпускам паштовай маркі.

Выдаўшы некалькі кніг у Вялікім княстве Літоўскім, Іван Фёдараў перасяліўся ў Львоў, дзе ў 1573 годзе заснаваў першую на Украіне друкарню. Тут 15 лютага 1574 года выйшла ў свет першая ўкраінская друкаваная кніга «Апостал». Тады ж выдаецца «Граматыка», якая больш вядомая як «Азбука» па той прычыне, што адзіны экземпляр гэтай кнігі, які ўцалеў і дайшоў да нас, не мае тытульнага аркуша, а значыць і назвы кнігі.

Буквар адкрыты ўжо ў наш час, калі ён быў паднесены ў дар бібліятэцы Гарвардскага універсітэта (ЗША). Устаноўлена, што ён змяніў некалькіх уладальнікаў. Першапачаткова кніга належала, як мяркуюць, сямейству Строганавых і ўжо ў пачатку XVII стагоддзя трапіла ў Італію. Адзначаючы 400-годдзе гэтай кнігі — першага рускага буквара, савецкая пошта выдала ў 1974 годзе марку. На ёй у дэкаратыўнай рамцы другая старонка буквара з вялікай літарай «А» пасярэдзіне і друкарскім знакам Івана Фёдарава — разгорнутым аркушам пергамента, на якім намаляваны згіб цячэння ракі і друкарскі вугольнік. Марка вельмі прыгожая дзякуючы ўдаламу спалучэнню колераў — чырвонаму з золатам, як рускае народнае адзенне таго часу — чырвонае з залатым шыццём.

Яшчэ ў 1934 годзе да 350-годдзя з дня смерці Івана Фёдарава ў нашай краіне былі выпушчаны 2 маркі. На фоне першага друкарскага станка і сучаснай ратацыйнай машыны мастак паказаў на марках помнік І. Фёдараву ў Маскве. Створаны ён па праекту таленавітага скульптара С. Валнухіна, быў узведзены ў 1909 годзе на сродкі, сабраныя па ўсенароднай падпісцы. Помнік адлюстраваны на многіх паштовых картках і канвертах. Пабудаваны помнік І. Фёдараву і ў Львове. Ён пастаўлены ў нашы дні і таксама адлюстраваны на паштовых канвертах.

У 1983 годзе споўнілася 400 год з дня смерці І. Фёдарава. Да гэтай даты была выпушчана марка з партрэтам першадрукара на фоне старажытнага арачнага склянення, пад якім размешчаны тэкст: «Рускі першадрукар Іван Фёдараў».

Леў КОЛАСАЎ.

ПРА БЕЛАВЕЖСКУЮ ПУЧШУ

Белавежская пушча — адзін са старэйшых запаведнікаў Еўропы. Размешчаны ён на вялікай тэрыторыі унікальнага ляснога масіву, гісторыя якога пачынаецца ў далёкім мінулым. Першыя звесткі аб пушчы знаходзім у Іпацьеўскім летапісу (983 год). Лёсам пушчы цікавіліся і выдаўцы газеты «Колокол» А. Герцэн і М. Агароў. У Белавежскай пушчы думаў пасяліцца вядомы філосаф-асветнік Жан Жак Русо. Прыгажосць белавежскіх лясоў паказаў у сваіх карцінах вялікі рускі мастак І. Шышкін. Пра пушчу напісаны раманы, складзены вершы і песні. Каля дзвюх тысяч навуковых і навукова-папулярных артыкулаў, нарысаў, брашур і кніг апублікаваны аб запаведным кутку Беларусі.

Аб усім гэтым можна даведацца з кнігі, якая нядаўна выйшла ў свет, — «Белавежская пушча. Анатаваны бібліяграфічны паказальнік айчыннай літаратуры». Выпусціла яе выдавецтва «Ураджай», аўтары — старэйшыя супрацоўнікі запаведніка М. Кавалькоў, С. Балюк, М. Буднічэнка. У кнізе даецца анатаваны паказальнік літаратуры, пачынаючы з 1835 года. Такім чынам, сёння можна адзначыць своеасаблівы 150-гадовы юбілей выхаду ў свет першай публікацыі аб Белавежскай пушчы. У кнізе ёсць імянны і тэматычны паказальнікі. У апошнім — публікацыі па наступных раздзелах: агульныя звесткі пра пушчу, прыродныя ўмовы, раслінны і жывёльны свет, паляванне, навукова-даследчая работа, музей прыроды, пушча ў літаратуры і мастацтве.

Гэта кніга ў аднолькавай ступені зацікавіць гісторыкаў і мастакоў, лесаводаў і пчаляроў, батанікаў і заолагаў. «Чалавеку, які ніколі не бываў у Белавежскай пушчы, цяжка ўявіць сабе веліч, своеасаблівую прыгажосць гэтага, у многіх месцах яшчэ першабытнага лесу. У ім няма аднастайнага, суровага, аднатоннага калярыту дрымучага паўночнага бору, — пісаў у XIX стагоддзі даследчык і аўтар буйнейшай гістарычнай манаграфіі Г. Карцаў. — Ён такі велічны, дзікі і разам з тым бясконца цікавы разнастайнасцю лясных пейзажаў». Гэта справядліва і сёння.

А. КУРСКОЎ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 913